Нефармат



# ЗАВІРУХА РЭАЛЬНАЯ І ВІРТУАЛЬНАЯ

**Новы тэлевядучы прагнозу надвор'я тэлерадыёкампаніі «Брэст» Багдан Завіруха стаў сапраўдней сенсацыяй месяца. Ён прыгожы, ветлівы, бездакорна стылёвы, валодае пачуццём гумару, вядзе праграму абсалютна без памылак і агрэхаў. Але ён... не чалавек. Ён і не робат, ён — віртуальнае ўвасабленне чалавека. Яго стварыла нейрасетка, ён уяўляе сабой новую ступень лічбавізацыі жыцця.**

Багдан Завіруха, несумненна, — вельмі цікавы праект, бо гэта першы ў краіне віртуальны тэлевядучы. Ідэю брастаўчане падгледзелі ў расійскіх калег. На стаўрапальскім тэлебачанні прагноз надвор'я агучвае віртуальная Сняжана Туманава. Ну а ў Брэсце з дапамогай нейрасетак стварылі свайго «дыктара». Гэта зусім не азначае, што тэлевізіёншчыкі падалі запыт, і нейрасетка адразу выдала гатовы прадукт. Над вобразам вядучага пэўны час працавалі спецыялісты ТРК «Брэст». Багдан увасобіў рысы некаторых рэальных людзей. Імя і прозвішча яму прыдумалі адпаведныя. Завіруха пасуе таму, хто прафесійна займаецца надвор'ем, бо нагадвае канкрэтную прыродную з'яву.

Вядома, гэтая цікавостка здольная прыцягнуць увагу аўдыторыі. Нехта назваў бы яе ўдалым маркетынгавым ходам, іншыя лічаць сучаснай забавай. На шматлікія пытанні журналістаў дырэктар брэсцкай тэлерадыёкампаніі адказвала жартам: «Багдан не есць і не спіць, не спазняецца на працу, не просіць зарплату, не ходзіць на бальнічны і ў адпачынак, але канкурэнт толькі прафесійна непрыдатнаму чалавеку...» Выходзіць, што ён яшчэ ўвасобленая мара любога работадаўцы: каб работнік не прасіў зарплаты і заўсёды быў на працы.

А калі сур'ёзна, то гэта ўжо не надта і сенсацыя, хутчэй, звычайны і лагічны працяг працэсаў камп'ютарызацыі, рабатызацыі, лічбавізацыі грамадства. І ён будзе працягвацца. Беспілотныя лятальныя апараты ўвайшлі ва ўжытак у многіх сферах жыцця, цяпер усё больш актыўна вядзецца гутарка пра беспілотныя машыны, трактары, аўтобусы. Робаты замяняюць чалавека на канвеерах, здольны замяніць яго ў небяспечных зонах: скажам, у працэсе выратавання пры аварыях, катастрофах. А пачыналася некалі з імкнення замяніць цяжкую ручную працу машынай. Сёння ў вёсках усе забыліся, якімі цяжкімі былі праполка альбо ўборка буракоў, лёну, дойка кароў. Усё робяць машыны. На дапамогу гаспадыням прыйшлі пральныя машыны, робаты-пыласосы, якім трэба задаваць праграму. Ну, а на любым прадпрыемстве, складанай вытворчасці на пярэдні план выходзіць лічбавы цэнтр кіравання. Назад дарогі няма, толькі — наперад.

І ўсё часцей можна пачуць апасенні, што робат, альбо лічба, паступова выцесніць чалавека, і людзі неўзабаве застануцца без работы, бо віртуальны працаўнік, як вядома, есці не просіць, правы не качае. А пісьменнікі-фантасты ўжо даўно страшаць чытачоў магчымымі паўстаннямі, войнамі робатаў, якія аднойчы захочуць знішчыць чалавецтва альбо падпарадкаваць яго сабе. Самі па сабе машыны наўрад ці прымуць такое рашэнне, усё ў рэшце рэшт будзе залежаць ад чалавека, ад таго, якую праграму ён закладзе ў тыя віртуальныя істоты альбо іх супольнасці.

Гледзячы на гэтага прыветлівага Багдана, падумалася: а што калі яны не выцесняць, не знішчаць чалавецтва, а, наадварот, навучаць яго жыць? Удзяўбуць, напрыклад, яму ў мазгі, што ваяваць і забіваць — гэта непатрэбна, нерацыянальна і злачынна, што трэба не глуміцца з прыроды, а ўсяляк абараняць і зберагаць яе, яшчэ — не выкарыстоўваць магчымасці інтэрнэту для масавага махлярства, аблапошвання пенсіянераў ды і маладзейшых карыстальнікаў. Ну і далей, у тым жа родзе. Бо людзі самі, як відаць, ужо не спраўляюцца з выклікамі.

Але ж трэба, каб знайшоўся нейкі геній і запраграмаваў увесь гэты віртуальны свет на стварэнне і развіццё, а не на разбурэнне і знішчэнне. Праўда, заўсёды ёсць рызыка, што геній акажацца з нутром антыпода Таго, Хто задумаў свет. І тады людзей чакае далёка не станоўчы фінал... Ды хочацца спадзявацца на лепшае.

Пакуль жа вясёлы і прывабны Багдан Завіруха папярэджвае нас пра дождж і спякоту, часам раіць прыхопліваць парасоны і заклікае берагчы сябе. У яго ясным, адкрытым поглядзе ўсё роўна прышчаку ўгадваецца штучнае, незямное — відаць, даецца ў знакі адсутнасць адбітка эмоцый на твары, як у мульцяшнай Снежнай Каралевы. І ўсё ж верыцца, што віртуальная завіруха не змяце з зямлі найлепшае, а нагадае пра яго першасныя, нязменнасць, прымусіць па-новаму адчуць заклік да згоды Багдановіча яго віртуознымі «...калі ўсе разам мы ляцім да зор».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.49 | 20.38 | 14.49 |
| Віцебск — | 5.34 | 20.31 | 14.57 |
| Магілёў — | 5.39 | 20.28 | 14.49 |
| Гомель — | 5.40 | 20.20 | 14.40 |
| Гродна — | 6.05 | 20.52 | 14.47 |
| Брэст — | 6.10 | 20.48 | 14.38 |

## Месяц

*Маладзік у 12.38. Месяц у сузор'і Льва.*

## Імяніны

*Пр. Антона, Ісака, Кузьмы.*

*К. Элеаноры, Сцяпана, Яўхіма.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 16 ЧЭРВЕНЯ

**У краіне**

**1898** год — нарадзіўся Майсей Калінікавіч Юскавец, беларускі вучоны ў галіне ветэрынарыі, акадэмік НАН Беларусі, Акадэміі сельскагаспадарчых навук Беларусі, доктар ветэрынарных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Аўтар больш як 150 навуковых прац.

**1913** год — нарадзіўся Менахем Бегін, палітычны дзеяч Ізраіля, юрыст. Ураджэнец Брэста. У 1977—1983 гг. — прэм'ер-міністр Ізраіля. Лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру (1978).



**1923** год — нарадзіўся (Аршанскі раён) Пётр Іванавіч Касцюковіч, поўны кавалер ордэна Славы.

**1933** год — нарадзіўся Віталь Паўлавіч Чацверыкоў, кінарэжысёр, народны артыст Беларусі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1974).

**1943** год — 16—17 жніўня прайшла Докшыцка-Крулеўшчынская аперацыя, бai партызанскіх брыгад 1-й Антыфашысцкай і «Жалязняк» з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

**2013** год — адбылося падпісанне дагавора аб стварэнні ЗАТ «БЕЛКАРТ». Заснавальнікамі выступілі ААТ «Банкаўскі працэсінгавы цэнтр», ААТ «ААБ Беларусбанк», ААТ «Белаграпрамбанк» і ААТ «Белінвестбанк».

**У свеце**

**1761** год — нарадзіўся Еўсцігней Іпатавіч Фамін, рускі кампазітар, найбуйнейшы прадстаўнік рускай музыкі XVIII стагоддзя. Адзін са стваральнікаў рускай оперы.

**1876** год — нарадзіўся Іван Якаўлевіч Білібін, расійскі мастак.

**1934** год — нарадзіўся П'ер Рышар, французскі акцёр. Здымаўся ў фільмах «Уцекачы», «Цацка», «Укол парасонам» і інш.



**1939** год — нарадзіўся Валерый Віктаравіч Румін, лётчык-касманаўт СССР, двойчы Герой Савецкага Саюза (1979, 1980). Удзельнічаў у чатырох касмічных экспедыцыях. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1984).

**1958** год — нарадзілася Мадонна (Луіза Вераніка Чыконэ), амерыканская эстрадная спявачка і актрыса. Аўтар серыі кніг для дзяцей. Лаўрэат прэміі «Грэмі». У 2008 годзе яе імя ўключана ў спіс членаў амерыканскай «Залы славы рок-н-рола».

**1969** год — нарадзіўся Павел Уладзіміравіч Санаеў, расійскі рэжысёр, сцэнарыст, акцёр. Лаўрэат маладзёжнай прэміі «Трыумф» (2005).

**Так гаварылі...**

**Генадзь БУРАЎКІН:**

*«Непрыгожых жанчын не бывае,*
*Проста шмат невідушчых мужчын».*

## УСМІХНЕМСЯ

**— Дзяўчына, вы гатовыя зняцца ў рэкламе зубной пасты?**

**— Так, вядома, гатова!**

**— Вось і выдатна, а то ў нас бабёр захварэў...**

Маленькія хітрасці: авіябілеты стануць крыху таннейшыя, калі стаць крыху багацейшым.

**Мужчыны лічаць, што многія дзяўчаты затрымаліся ў дзяцінстве. Аднак дайце жанчыне лялькку — і яна яе проста патрымае. А вось калі мужыку трапіць у рукі рагатка...**





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.431. Індэкс 63850. Зак. № 1853.

Нумар падпісаны ў 19.30 15 жніўня 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12